УДК 882.6 – 3 (091) : 39

**В.Ю. Бароўка**

# Этнаграфізм у творчасці маладых беларускіх празаікаў 20-х гадоў XX стагоддзя

Дваццатыя гады мінулага стагоддзя ўвайшлі ў гісторыю беларускай прозы як перыяд яе актыўнага колькаснага і якаснага росту. Менавіта ў гэты час пачынаюць свой творчы шлях такія пісьменнікі, як Кузьма Чорны, Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Міхась Лынькоў, Васіль Каваль, Лукаш Калюга, Сымон Баранавых і іншыя.

Маладыя аўтары зрабілі свой унёсак у мастацкае адлюстраванне жыцця беларусаў, прычыніліся да фарміравання нацыянальнага аблічча беларускай прозы.Трэба памятаць, што «нацыянальную тыпалогію любой літаратуры нельга разумець як нешта абавязкова ўласцівае ўсім без выключэння яе прадстаўнікам і з'явам. Размова можа ісці толькі пра пераважныя ідэйна-мастацкія тэндэнцыі і пра найбольш рэпрэзентатыўныя менавіта ў гэтых адносінах гісторыка-літаратурныя факты» [1]. Нацыянальная адметнасць літаратуры выяўляецца ў самых розных формах, адной з якіх выступае этнаграфізм – узнаўленне матэрыяльных і духоўных асаблівасцей жыцця пэўнага народа. Разгляд узаемаадносінаў мастацкай літаратуры з матэрыяльна-бытавой і духоўнай культурай беларускага народа пакуль належыць да праблем малараспрацаваных, хаця пэўныя захады ў гэтым накірунку рабіліся І. Чыгрыным і М. Тычынам, але яны абмяжоўваліся даследаваннем узаемаадносінаў літаратуры і фальклора.

Маладыя беларускія празаікі імкнуліся адлюстраваць свой неспакойны час, шукалі адказы на анталагічныя пытанні. Дамінантнай мадэллю рэчаіснасці ў творах маладых пісьменнікаў таго перыяду была вясковая рэчаіснасць, шмат увагі яны аддавалі мастацкаму асэнсаванню быту вяскоўцаў, паўсядзённаму і святочнаму, звычайнаму і рэліктаваму.

Этнаграфічны кантэкст твораў маладых беларускіх празаікаў 20-х гадоў XX стагоддзя забяспечваўся ўключэннем у мастацкую тканіну твораў розных народных паэтычных (вобразных, моўных, стылістычных) элементаў і этнаграфічных рэалій. У сістэме літаратурнага твора іх можна разглядаць як своеасаблівыя «этна-эстэтычныя адзінкі» (У. Далгат). Этнаграфічны дыскурс у прозе 20-х гадоў вызначаўся пісьменніцкай індывідуальнасцю, спецыфікай самога «эстэтычнага аб'екта», ідэйна-тэматычнай зададзенасцю твораў. Дваццатыя гады XX стагоддзя былі часам перамен, кароткім перыядам сацыякультурнай энтрапіі, калі былыя каштоўнасныя арыенціры грамадскага жыцця адыходзілі ў нябыт, а новыя толькі нараджаліся, таму літаратура ўвогуле, а проза ў прыватнасці не маглі існаваць як маналагічная ў ідэйным і стылёвым плане сістэма.

Маладыя празаікі 20-гадоў неадназначна ацэньвалі вясковую рэчаіснасць, старыя, традыцыйныя народныя ўяўленні, звычаі. Пісьменнікі рэалістычнага накірунку этнаграфічны кантэкст найперш уводзілі для тыпізацыі характараў і абставінаў, сведчанне таму – творы Кузьмы Чорнага, Платона Галавача, Кандрата Крапівы, Лукаша Калюгі, Сымона Баранавых.

Адмоўнае стаўленне да старой беларускай вёскі характэрна творам Платона Галавача. У вясковым быце пісьменнік асуджаў цемнату, эгаізм,

індывідуалізм, пляткарства. Для прыкладу, у апавяданні «Кнак» (так вяскоўцы называлі старыя мікалаеўскія грошы) аўтар па-майстэрску апісвае сватанне і падрыхтоўку да вяселля ў сялянскай сям'і. Пры гэтым падкрэсліваецца прагматызм вяскоўцаў, бо будучыя зяць і цесць заўзята спрачаюцца з-за пасагу, абодва бакі клапоцяцца пра свае матэрыяльныя інтарэсы. Літаратура 20-х і 30-х гадоў часта звяртала ўвагу на такую бытавую дэталь, як вопратка персанажа. У творах Галавача і Чорнага гэтая дэталь «высвечвала» характар героя. Так, пра старога Патупчыка з апавядання «Кнак» П. Галавач заўважае: «Заўсёды (і ўзімку, і ўлета) у шэранькай світцы, падпяразаны прывезенай з войска папругай» [2]. Шэрая світка –элемент вопраткі беларускага селяніна, аднак аўтар падкрэслівае, што світку з папругай герой носіць пастаянна, а значыць, чалавек ён або бедны, або скупы.

Адзін з самых таленавітых пісьменнікаў той пары Кузьма Чорны ў творах 20-х гадоў праз этнаграфічныя дэталі высмейваў патрыярхальную вёску. Асабліва ярка гэта выявілася ў апавяданнях «Дзякуй богу, як шклянка», «Максімка». Іранічна пададзена спрэчка вяскоўцаў у творы «Максімка»: «Нехта яшчэ падаў голас, што трэба пачакаць маладзіка і тады везці , а другія яго асмяялі, закрычаўшы, што гэта сеяць трэба маладзіком, а не везці гатовае. І тут жа пачалася гарачая спрэчка, калі лепш сеяць жыта – маладзіком ці «сходнімі днямі». Па большасці галасоў выйшла, што не маладзіком і не «сходнімі днямі», а «самым поўным», але тут сталі падавацца галасы, што гэта «поўным» добра ўстаўляць дубэльты ў вокны – макрэць не будуць» [3]. У вядомым рамане « Зямля» этнаграфічны каларыт, бытавыя замалёўкі давалі багаты матэрыял для асэнсавання быцця беларуса 20-х гадоў.

Актыўна ўводзіўся этнаграфічны кантэкст у творы Лукаша Калюгі, прыроджанага бытапісальніка і філосафа. У яго апавяданнях і аповесцях 20-х гадоў XX стагоддзя старадаўнія звычаі, народныя прыкметы падаюцца, каб паіранізаваць з наіўнасці вяскоўцаў. Так, у апавяданні «Тахвілін швагер» аўтар дасціпна высмейваў сляпую веру ў народныя прыкметы. Юстап Заблоцкі хацеў мець у гаспадарцы шмат авечак. «Кажуць, што жытнія спарышы (каласы, што па два, па тры з адной саломіны растуць) надта ж памагаюць, калі котным авечкам даваць, надта ж тады вялікі прыплод будзе» [4]. Юстап стаў карміць авечак спарышамі, але добры прыплод у яго гаспадарцы давалі толькі кошкі. Заблоцкі пастаянна кіруецца прыкметамі, таму нязменна трапляе ў анекдатычныя сітуацыі. Аднойчы ён узяў шчаня, у якога было чорна ў роце, спадзяваўся, што Жук будзе злым, але шчаня аказалася вельмі ласкавым. Апавяданне «Тахвілін швагер» грунтавалася на прыёме дэміфалагізацыі. Многія вяскоўцы жылі бедна і верылі ў неверагодныя рэчы: існаванне фармазонскіх грошай, «незнашоных» ботаў, сілу праклёну, існаванне чараўнікоў і чараўніц. Высвятляецца, што баркаўчане проста не заўважалі відавочнага. Народная фантазія прыдумала, што ў суседа Юстапа Андрука ёсць боты, якія не зношваюцца. На самой жа справе Андрук беражліва ставіўся да ботаў, рэдка іх абуваў, таму і мелі яны доўгі век. Дасціпныя гісторыі пра вясковых дзівакоў не толькі забаўлялі чытача, але і прыводзілі да высновы, што чалавек павінен кіравацца здаровым сэнсам, а не сляпой верай. Вядомы на Беларусі жарт пра Заблоцкага, які хацеў, але не змог зарабіць на мыле, творча абыгрываўся Калюгам у аповесці «Нядоля Заблоцкіх» ( першая частка яе была закончана ў 1929 г.). Метафарычны сэнс мае назва твора, бо яна пазначае падагульненне жыццёвага шляху персанажаў твора: кожны з Заблоцкіх хоча падмануць лёс, але нікому з іх гэта не ўдаецца. Этнаграфічны каларыт у творы Калюгі прыўносілі і элементы сказавай формы апавядання. «Сказавае маўленне, – пісала Н. Драгамірэцкая, – гэта змястоўная маўленчая форма з устаноўкай на чужое слова, слова розных сацыяльных пластоў

народа, пераважна яго нізоў» [5]. Аўтар уводзіў у структуру твораў герояапавядальніка з народа («Лук'ян – капераціўскі сабака», «Баркаўцы – добрая вёска, а баркаўчане – вясёлыя людзі», «Трахім – штучны чалавек», «Іллюкдаследчык», «Тахвілін швагер», «Нядоля Заблоцкіх»), аповед пра падзеі і герояў якога стылізаваўся пад вуснае маўленне чалавека з народа, шмат выкарыстоўвалася прастамоўяў і дыялектызмаў («асядласць», «крутаммутам», «небагавое», «хорма», «увавіў» і г.д.).

Даволі моцнай у прозе 20-х гадоў была рамантычная плынь, яркімі прадстаўнікамі якой сталі Міхась Зарэцкі і Васіль Каваль. У прозе Міхася Зарэцкага знайшлі адбітак вострыя пытанні таго часу, у ёй адчуваецца пераломнасць таго моманту, які перажывала грамадства, калі старыя ўяўленні пра жыццё падвяргаліся сумненню, а новыя яшчэ не ўвайшлі трывала ў чалавечую свядомасць. М. Зарэцкі практычна не звяртаўся да чыста этнаграфічных малюнкаў, толькі ў рамане «Сцежкі-дарожкі» аўтар акружыў паэтычным арэолам апісанне купальскага свята. «Купала – гэта ж такое любае бязбожнае свята, у ім так многа дзікай паэзіі, у ім з паганскай вольнасцю разгортваецца чалавечая істота, шукае волі і радасці, хоча зліцца з чароўным сонечным богам – Прыродай, бо гэты бог – сама воля і радасць. А колькі паэзіі ў гэтых наіўных варожбах, у ахінутым палахлівай тайнасцю шуканні кветкі шчасця, якая таму і вабіць да сябе, што ніколі не знаходзіцца. У гэтых варожбах цудоўна ўваскрасае дзяцінства чалавечага роду, апавітае густой сеткай забабонаў і чараўніцтва, у гэтых варожбах уваскрасае першабытны чалавек – дзіця магутнага і страшнага дзіва – Прыроды» [6]. Свабодная стыхія Купалля, яго таямнічасць прывабліваюць панскую дачку Раісу Янаву і закаханага ў яе інтэлігента ў першым пакаленні Васіля Лясніцкага. На Купалле Раіса звівае два вянкі не з кветак, а з папараці, на іх ставяць дзве свечкі і пускаюць на ваду, хутка свечкі пагаслі . Гэты эпізод у кантэксце твора набываў сімвалічны сэнс: героі не знайшлі ў жыцці сваю папараць-кветку. Дарэчы, у рэалістычна-бытавым плане падавалася купальскае свята ў «Нядолі Заблоцкіх» Калюгі: «На Купалле не толькі з песень, але і многа з чаго няма ніякага здарэння. Калі назаўтра, на Яна, пойдзе каторы чалавек поле паглядзець ды ўбачыць у пшаніцы лагво. Не будзе ён дадумляцца, што тут рабілася, як гэта здарылася. Трэба ж дзяўчатам у пшаніцы пакупацца ў купальскую вясёлую ноч. Трэба ж змыць з сябе чарнату, загару свае працы, прыдабыць сабе харашэйшай, бялейшай пшанічнай красы» [4, с. 228]. Параўнанне эпізодаў, дзе Зарэцкі і Калюга паказваюць купальскае свята, сведчыць, што ступень мастацкай дэфармацыі жыццёвага факта, калі ён трапляе ў поле зроку мастака, залежыць ад аўтарскай індывідуальнасці, аўтарскага светаадчування.

«Сцежкі-дарожкі» М. Зарэцкага – раман пра пошукі чалавекам сэнсу жыцця, дабра і праўды. Народная мара пра свабоду і шчасце адбілася ў «байцы» пра Іваньку-Прастачка, расказанай Лясніцкаму старым перавознікам Саўкам. Іванька-Прастачок ігрой на дудцы зваў людзей на барацьбу: «І кажуць, што быццам прыйдзе час, калі пачуюць тую Іванькаву дудку і ўсе разам падымуцца, каб за праўду пастаяць. Вось і стануць тады ўсе людзі роўныя...» [6, с. 147]. «Байка» пра дудара Іваньку – стылізацыя пад народную казку з празрыстым падтэкстам. У мастацкай тканіне твора яна прадстае штучным утварэннем, якое не ўносіць нічога новага у трактоўку асноўнай тэмы рамана.

Васіль Каваль – прадстаўнік лірыка-рамантычнага пачатку ў прозе 20-х гадоў. Яго першыя творы нярэдка ўяўлялі мастацкую перапрацоўку матываў народных легендаў і казак («Буй-вецер», «Легенда пра песню», «Пра кветку «брат-сястра»). В. Каваль адчуваў незваротнасць мінулага. Невыпадкова ў творы «Пра кветку «брат-сястра» ён з сумам заўважаў: «Беларусь мая песенна-казачная, ты губляеш-раскідваеш свае пялёсткі ў рытмах новага

буйна-квяцістага,
гулка-звонкага жыцця!
Зараслі ў даль прыгожа-песенную сцежкі рутай-мятай пахучаю» [7].

Назву першаму зборніку пісьменніка дала этнаграфічная па сваім характары замалёўка «Як вясну гукалі». Яна пачыналася эпіграфам з народнай песні

А лесу, мой лесу, што ты не зялёны?
А як жа мне лесу зеляному быці:
Сколькі было птушак – усе паляцелі,
Толькі засталася шэрая зязюля,–
Й тая кукавала – к сялу прылятала... [8].

У замалёўцы было шмат этнаграфічных падрабязнасцей, якія выконвалі важную сэнсавую функцыю. Так, гуканне вясны асацыіравалася з заклікання шчасця. Малады аўтар паэтызаваў народныя песні, народныя звычаі, аднак пры гэтым звяртаў увагу на заняпаласць сучаснай яму вёскі, на хаты, у якіх салома валіцца са стрэх і гніюць вуглы.

Вельмі часта апавядальнік і героі ў творах В.Каваля выказалі сваё захапленне народнымі песнямі. Цытацыя ўрыўкаў з народных песень выконвала характаратворчую ролю, прадстаўляла апавядальніка і герояў натурамі чулымі і паэтычнымі, надавала творам эмацыянальную афарбоўку. Эпіграфам да аповесці «Сяльчане» Каваль узяў радок з вясельнай песні «Сяло, маё сяло, што ж ты не вясёла?..». Як вядома, у фальклоры шлюб сімвалізуе пачатак новага жыцця, прадчуваннем змен на вёсцы напоўнена і аповесць: «А сяло Чмарава на ўзгор'і – вялікае, а хаты параскіданы, як папала: некалькі двароў ёсць новых, а то ўсё старыя, з абваленымі вугламі. У гэтым відно быццам нейкае нядбальства чмараўцаў. «Абы як было, абы жыць можна!» Усё гэта старое, атуленае рыззём, выказвае сваю сталую постаць. Хочуць чмараўцы перайсці к нечаму новаму, усё збіраюцца, ды ніяк не могуць гэтага зрабіць...» [7, с. 17]. «Сяльчане» – твор апісальны, праз аповесць праходзіў каляндарны цыкл земляробчай працы (сяўба, касьба, жніво ). Чыста знешне час як бы рухаецца па загадзя зададзенай схеме, аднак нельга адхінуцца ад павеваў новага, ад зрухаў у свядомасці людзей. На першы погляд, прыгажуня Алёна – сама патрыярхальнасць «у рабым андараку і босая», з белай хусткай на галаве, а на самой справе яна цягнецца да новага жыцця, марыць пра вучобу.

Этнаграфічныя дэталі дапамагалі аўтару паказаць нацыянальны характар беларуса. Як і яго зямляк Максім Гарэцкі, В. Каваль мог бы заявіць: «А народ мой – народ-лірнік, народ-паэт», – бо лічыў адной з асаблівасцей народнага характару імкненне пазнаць таямніцы жыцця. Пры адлюстраванні народных звычаяў, абрадаў, прыкмет Васіль Каваль быў далёкі ад іх бязлітаснага высмейвання пад маркай вясковай цемнаты і сумнай і заганнай спадчыны мінулых часоў. Для яго свет народных уяўленняў быў вынікам шматвяковага народнага вопыту. У прозе 20-х гадоў В. Каваль звяртаўся да паасобных прыёмаў фальклорнай паэтыкі. Напрыклад, у аповесці «На загонах» пачатак твора блізкі да казачнага: «Тры дарогі расцягнуліся за сялом, як у казцы той» [8, с. 52]. Тыя тры дарогі навявалі людзям сум і думкі пра шчасце, якога шукае і не знаходзіць чалавек. Згадка пра тры дарогі – пэўная даніна тэме, бо аўтар расказвае пра мінулыя, дарэвалюцыйныя гады і такім чынам падкрэслівае часавую дыстанцыю. Імперыялістычная ж вайна у гэтым творы супастаўляецца з вяселлем. У мове твораў В. Каваля нярэдка сустракаліся народныя эпітэты, накшталт наступных: «А шчасце тое, дзе яго знойдзеш ? Ці ў чыстым полі, ці ў глухім бары, ці за сінім морам ?». Яны надавалі аўтарскаму стылю эмацыянальнасць, лірызм.

Маладымі беларускімі празаікамі 20-х гадоў, якія ў большасці сваёй былі дзецьмі вёскі, этнаграфізм успрымаўся як унутраная эстэтычная неабходнасць. Яна

дыктавалася імкненнем адэкватна паказаць рэчаіснасць. Ствараемы пісьменнікамі мастацкі свет адлюстроўваў як атмасферу гістарычнага часу, так і спецыфіку народнага светабачання і аўтарскай індывідуальнасці.


## ЛІТАРАТУРА

1. ***Купреянова Е.П., Макогоненко Г.П.*** Национальное своебразие русской литературы. Л., 1976. С. 6.
2. ***Галавач П.*** Збор твораў: У 3 т. Т.1. Мн.,1958. С. 156.
3. ***Чорны К.*** Збор твораў : У 8 т. Т.1. Мн.,1972. С. 149.
4. ***Калюга Л.*** Творы. Мн., 1992. С. 375.
5. ***Драгомирецкая Н.В.*** Стилевые искания в ранней советской прозе // Теория литературы: Осн. проблемы в ист. освещении: В 3 кн. Кн. 3 М.,1965. С. 136.
6. ***Зарэцкі М.*** Збор твораў: У 4 т. Т.2 . Мн., 1990. С. 147.
7. ***Каваль В.*** Як вясну гукалі . Мн.,1927. С. 70-71.
8. ***Каваль В.*** Выбранае. Мн.,1961. С. 12.



## S U M M A R Y

*In the artistik ethnographism in the prosaik works of the young Belorusian writers of the 20th years of the XX century is investigated.*



*Поступила в редакцию20.05.2002*

УДК 882.6–1



**І.М. Гоўзіч**


# Элегія ў творчасці Янкі Сіпакова

Даўно ўжо вядома, што жанравая структура сённяшняй лірыкі – «разамкнёная», бо яна карыстаецца і ўзбагачаецца лепшымі дасягненнямі трох родаў літаратуры. І не менш выразны «сінтэтызм» лірычнай паэзіі Янкі Сіпакова выяўляецца ў ягонай элегіі. Элегія, як і ода і балада, мае таксама даўнюю гісторыю. Лічыцца, што творы элегічнага характару – адны з самых старажытных твораў паэтычнага мастацтва. Пра гэта чытаем у новых кніжках В.П. Рагойшы, адрасаваных перш за ўсё спецыялістам філолагам. У апошнім па часе выданні гэтага даследчыка чытаем: «Вытокі беларускай літаратурнай элегіі – у народнай песні (працоўнай, абрадава-сямейнай), у вопыце рускай і сусветнай літаратур, што ўплывалі на беларускую. Элегія як жанр з'явілася ў ХІХ стагоддзі («Думка» Ф. Багушэвіча, «Могілкі» невядомага аўтара). Значнае месца займае ў творчасці М. Багдановіча, выяўляючы асабістыя і грамадскія матывы...» [1]. У пачатку свайго артыкула В.П. Рагойша адзначае старажытнасць паходжання жанра: у эпоху антычнасці элегія спачатку была тэматычна разнастайная (нараджэнне, жыццё і смерць), а затым у старажытным Рыме стала жалобнай песняй (плачам над нябожчыкам – І.Г.), скаргай на цяжкі асабісты ці грамадскі лёс (Тыбул, Авідзій, Катул). Усё сказанае тэарэтыкам слоўнага мастацтва доказнае, цікавае, нясе энцыклапедычную інфармацыю. Вось толькі час з'яўлення літаратурнай элегіі ў беларускай літаратуры, як нам думаецца, не зусім правільна аднесены аўтарам да ХІХ стагоддзя, другой паловы яго. Між тым, як ужо «Плач Яраслаўны» са «Слова аб паходзе Ігаравым» – своеасаблівая staраўсходнеславянская элегія ХІІ стагоддзя, з элементамі эпітафіі, блізкай да яе па змесце [2]. Не меншую рацыю будзем мець мы, калі вытокі